## 2 СЕМЕСТР

41. **Asĭnos non curo**. – На аслоў не звяртаю ўвагі.
42. **Considĕra quid dicas, non quid cogĭtes**. – Сачы за тым, што гаворыш, а не за тым, што думаеш.
43. **Doctrīna est fructus dulcis radīcis amārae**. – Вучонасць – салодкі плод горкага кораня.
44. **Fortes fortūna adjŭvat**. – Храбрым лёс дапамагае.
45. **In altum tendens cadit ab alto**. – Хто высока ўзлятае, той адтуль і падае.
46. **Invĕnit patella opercŭlum**. – Знайшоў сабе рондаль накрыўку.
47. **Male parta male dilabuntur**. – Несумленна здабытае прахам пойдзе.
48. **Minutŭla pluvia imbrem parit**. – З малой хмаркі вялікі дождж.
49. **Nihil lucrātur, ausus cui nil famulātur**. – Нічога не выйграе той, хто не рызыкуе.
50. **Quod fuit, nunquam revertētur**. – Што было, тое ніколі не вернецца.
51. **Asĭnus asinōrum in saecŭla saeculōrum**. – Асёл з аслоў на векі вечныя.
52. **Consuetūdo est altĕra natūra**. – Звычка – другая натура.
53. **Dulce est desipĕre in loco**. – Прыемна ў свой час падурэць.
54. **Fortūna favet fatuis**. – Шчасце дурняў любіць.
55. **Incĭdit in foveam, quam fecit altĕri**. – Трапіў у яму, якую вырыў іншаму.
56. **Labĭtur a mente cito res bona, sed mala lente**. – Дабро хутка забываецца, зло доўга помніцца.
57. **Malum nullum est sine alĭquo bono**. – Не бывае ліха без якога-небудзь дабра.
58. **Ne diffĕras in crastĭnum**. – Не адкладай на заўтра (пар. Адклад не йдзе ў лад).
59. **Non clangunt lituo tempŏre fata suo**. – Смерць, прыходзячы ў свой час, не гудзіць у сігнальны ражок.
60. **Quot homĭnes, tot sententiae**. – Колькі людзей, столькі думак.
61. **Audi multa, loquĕre pauca**. – Слухай многа, гавары мала.
62. **Cribro aquam haurīre**. – Чэрпаць ваду рэшатам.
63. **Dum ferrum candet, tundĭto**. – Куй жалеза, пакуль яно гарачае.
64. **Fortunātus domi maneat**. – Шчаслівы няхай застаецца дома (г.зн. ад добрага лепшага не шукаюць).
65. **Ingenium mala saepe movent**. – Часта бяда прыбаўляе розуму.
66. **Labor omnia vincit imprŏbus**. – Усё перамагае ўпартая праца.
67. **Malum vas non frangĭtur**. – Дрэнная пасудзіна не б’ецца.
68. **Ne Juppĭter quidem omnĭbus placet**. – Нават сам Юпітэр не дагодзіць усім.
69. **Novus rex, nova lex**. – Новы цар – новы закон.
70. **Sero venientĭbus ossa**. – Хто позна прыходзіць, таму застаюцца косці.
71. **Aurea mediocrĭtas**. – Залатая сярэдзіна.
72. **Cui fatum e furca est pendĕre, haud mergĭtur unda**. – Каму лёс наканаваў быць павешаным, той не патоне.
73. **Duos qui lepŏres sequĭtur, neutrum capit**. – Хто два зайцы гоніць, ніводнага не здагоніць.
74. **Fruĕre vita, dum vivis**. – Цешся жыццём, пакуль жывеш.
75. **Ingentĭbus inhians divitiis etiam mediŏcres amittit**. – Хто прагне вялікага багацця, губляе нават сярэдняе.
76. **Lacrĭmae nihil profutūrae**. – Слёзы нічым не дапамогуць.
77. **Manus manum lavat**. – Рука руку мые.
78. **Nemo potest dura natūrae solvĕre jura**. – Ніхто не можа змяніць суровыя законы прыроды.
79. **Omnia tempus habent**. – Усё мае [свой] час.
80. **Unus flos non facit ver**. – Адна кветка не робіць вясны.